# “Калісь глядзеў на сонца я...”

## Галерэя партрэтных вобразаў да 135-годдзя Максіма Багдановіча



***Аляксандр Ксяндзоў*. Увечары. Сямейны партрэт.**

1981 г. Палатно, алей.

*Літаратурны музей Максіма Багдановіча.*

# БАЦЬКАВА КНІГА

## "ПЕРЕЖИТКИ ДРЕВНЯГО МІРОСОЗЕРЦАНІЯ У БѢЛОРУССОВЪ" АДАМА БАГДАНОВІЧА

Дзе яшчэ зберагацца рарытэтным выданням, як не ў літаратурным музеі. Але нават у багатых кніжных зборах музея Максіма Багдановіча ёсць кнігі, якія можна назваць асаблівымі. Адна з іх – "Пережитки древняго міросозерцанія у бѣлоруссовъ" Адама Багдановіча.

Чым жа яна адметная, акрамя таго, што аўтар яе – бацька геніяльнага паэта?

Па-першае, гэта магчымасць зазірнуць у духоўны свет продкаў Максіма Багдановіча. Этнаграфічныя матэрыялы, якія ў ёй выкладзены, – не проста фальклорныя запісы, але сямейная традыцыя, занатаваная на аснове звестак Рузаліі Казіміраўны Асьмак, бабулі Адама Ягоравіча. Учэпістая памяць дазволіла маладому навукоўцу да дробязей захаваць асаблівасці традыцыйнага светасузірання, паказкі пра міфічных істот, прымхі і забабоны, што бытавалі ў Халопенічах, адкуль паходзілі Багдановічы.

Менавіта паводле "Пережитков..." маленькі Максім знаёміўся з беларускай мовай. Не дзіва, што адзін з першых цыклаў вершаў М. Багдановіча пераклікаецца з кнігай і прысвечаны беларускім нячысцікам. А пра аднаго з іх паэт пі-




**Вокладка кнігі Адама Багдановіча.**
*Літаратурны музей Максіма Багдановіча. КП 3905.*




**Аўтограф Адама Багдановіча Мікалаю Ланіну.**
*Літаратурны музей Максіма Багдановіча. КП 7396.*

саў так часта, што займеў ад Альберта Паўловіча мянушку *Лесавік*.

Па-другое, "Пережитки древняго міросозерцанія у бѣлоруссовъ" А. Багдановіча – сапраўдны кніжны рарытэт, яшчэ і з пікантнай гісторыяй.

У лісце да Вацлава Ластоўскага ад 7 лістапада 1913 г. Максім Багдановіч пісаў: «*Дабрыдзень, пане Вацлаве! Разам з лістом пасылаю Вам у прэзент кніжку бацькі. Вы, здаецца, любіце рожныя "унікумы"; ну, дык гэта унікум і ёсць, бо надрукавана яна была ў невялічкім ліку экземпляраў і ў прадажу пушчана не была, – бацьку ў ёй нешта не спадабалася, і ён узяў яе з кніжных магазінаў, свой адзіны экз.<empляр> я аддаў "Н.<ашай> н.<ве>"*».

Чаму ж Адам Багдановіч вярнуў кнігу з продажу? Сказаць адназначна цяжка. Даследчык Мікола Трус згадвае, што кніга была прыхільна сустрэта крытыкай і атрымала ўхвальныя водгукі (Научное обозрение, 1895, № 33; Живая старина, 1895, т. 3–4; Новости, 1895, № 230; Wisła, 1897, т. 11, вып. 3), але не абышлося без невялікага казусу.

Рэч у тым, што Адам Ягоравіч, які быў карэспандэнтам этнографа Паўла Шэйна, паспеў атрымаць за сабраныя ім звесткі даволі вялікія грошы. У лісце да мовазнаўцы Яўхіма Карскага ад 15 снежня 1895 г. Павел Васільевіч пісаў: "[А. Е.] Богданович, перебравши у меня около 50 р[уб]. за свои сообщения, добрую часть которых он вновь два раза перепродал разным редакциям" – і нават не даслаў яму кніжкі. Мяркуючы з рэакцыі П. Шэйна, рабіць так у навуковым асяродку было не прынята.

Акрамя ўрыўкаў, апублікаваных у шэйнаўскім зборніку, "Пережитки..." друкаваліся ў згаданым вышэй "Научном обозрении" за 1894 г. і толькі потым з'явіліся асобнай кніжкай. Магчыма, непрыемная сітуацыя была адной з прычын таго, што Адам Ягоравіч прыбраў кнігу з продажу.

У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча захоўваюцца тры арыгінальныя выданні "Пережитков..." у тым ліку асобнік з дароўным надпісам аўтара.

Адрасаваны ён Мікалаю Аляксандравічу Ланіну, з кім Адам Багдановіч пазнаёміўся ў Ніжнім Ноўгарадзе праз Максіма Горкага. Мікалай быў сынам знакамітага адваката Аляксандра Ланіна, у якога М. Горкі працаваў справаводам.

Надпіс зроблены з гумарам – відаць, што адносіны паміж імі былі сапраўды прыязнымі: "Николаю Александровичу Ланину в знак приязни и с искренним пожеланием чтобы в его душе звон малиновый положительно возрос до грома раскатов. А. Богданович. 1900 г. в Декабре".

Застаецца толькі здзіўляцца, колькі гісторый можа хавацца за адной кнігай. Магчыма, той самай кнігай, з якой пачаўся геніяльны творца – Максім Багдановіч.

**Міхась БАРАНОЎСКІ,**
загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.